# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*2023 год*

Ліст да адзінаццацікласнікаў Беларусі Inbox ×

M

Шаноўны адзінаццацікласнік!
Мяне завуць Даніэль. Я жыву далёка ад Беларусі, але хачу пазнаёміцца з тваёй краінай. Прачытаў, што ў Беларусі шмат рэк і азёр, чыстыя лясы і гаі. А яшчэ твая краіна мае багатую і цікавую гісторыю і мову. Я пачаў спецыяльна вывучаць беларускую мову і літаратуру. Некаторыя пытанні для мяне застаюцца складанымі, таму прашу дапамогі. Упэўнены, што ты зможаш гэта зрабіць!

--
З павагай,
Даніэль

*Сёння мы разам з вамі зробім падарожжа ў свет беларускай мовы і літаратуры разам з Даніэлем, пазнаёміўшы яго з некаторымі асаблівасцямі беларускай мовы і гранямі беларускага мастацкага слова.*

## 11 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.** Першы наш прыпынак – краіна Лексікалогія. Тут шмат розных “жыхароў”, сярод іх ёсць амаформы – гэта розныя па значэнні словы, якія супадаюць у пэўнай граматычнай форме. Часта гэта словы розных часцін мовы (*вусны адказ – прыгожыя вусны*), радзей – адной (*лячу ў самалёце – лячу дзяцей*). Дапамажыце Марку размежаваць наступныя словы (словаформы), праілюстраваўшы іх магчымыя значэнні адпаведным кантэкстам. Назавіце часціну мовы, да якой яны адносяцца, і зрабіце іх графічны падзел на марфемы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Разрыў – разрыў; дам – дам; калі – калі; акуні – акуні.*

| Часціны мовы, да якіх належаць амаформы | Словазлучэнні (сказы), якія ілюструюць лексічнае значэнне амаформаў | Падзел слова на марфемы |
|---|---|---|
| *разрыў –* | | |
| *разрыў –* | | |
| | | |
| *дам –* | | |
| *дам –* | | |
| | | |
| *калі –* | | |
| *калі –* | | |
| | | |
| *акуні –* | | |
| *акуні –* | | |

**Заданне 2.** У Фразеаландыі, як і ў іншых экзатычных краінах, звычайныя рэчы (словы) часта паўстаюць перад намі ў вельмі нечаканых і непрадказальных праявах і незвычайна паводзяць сябе, бо вельмі цесна звязаны з жывой народнай традыцыяй, з невычэрпнай людской фантазіяй.

Паспрабуйце зарыентавацца “на мясцовасці” і вызначыце:

А) Які кампанент прапушчаны ў кожным з прыведзеных фразеалагізмаў, выбраўшы яго з пяці прапанаваных у трэцім слупку. Насупраць абранага кампанента пастаўце ў чацвёртым слупку знак “+”.

Б) Які з прапушчаных кампанентаў у спалучэнні з кампанентам *языком* дае фразеалагізм, што **не ўступае** ў сінанімічныя адносіны з фразеалагізмамі, якія ўтвараюцца з удзелам усіх астатніх кампанентаў. Насупраць абранага кампанента пастаўце ў чацвёртым слупку знак “–”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

А)

| Фразеалагізм | Значэнне | Кампанент | + |
|---|---|---|---|
| *як ... у (ў) бочцы* | ‘у вялікай колькасці. Пра мноства людзей у якім-н. месцы (у памяшканні, вагоне і пад.)’ | *зярнят* | |
| | | *бобу* | |
| | | *мёду* | |
| | | *селядцоў* | |
| | | *кількі* | |
| | | | |
| *малая ...* | ‘нязначны, малаважны, неўплывовы чалавек’ | *птушка* | |
| | | *пташка* | |
| | | *сошка* | |
| | | *шышка* | |
| | | *шапка* | |
| | | | |
| *... язык* | ‘круты і небяспечны паварот на дарозе’ | *цешчын* | |
| | | *змяіны* | |
| | | *жабін* | |
| | | *сабакаў* | |
| | | *хамелеонаў* | |
| | | | |
| *ні слова ні ...* | | *намёку* | |
| | | *гуку* | |
| | | *слоўца* | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ‘абсалютна нічога (не гаварыць, не адказваць, не расказваць і пад.)’ | *паўслова* | |
| | | *сказа* | |
| | | | |
| *была ў … хата* | ‘няма і не было каго-, чаго-н.’ | *малпы* | |
| | | *зайчыка* | |
| | | *вожыка* | |
| | | *ката* | |
| | | *сабакі* | |

Б)

| | | | |
|---|---|---|---|
| *… языком* | агульнае значэнне ‘гаварыць упустую, пустасловіць’ | *малоць* | |
| | | *варочаць* | |
| | | *мянціць* | |
| | | *пляскаць* | |
| | | *трапаць* | |

**Заданне 3.** Кожны дасведчаны турыст ведае, што любая вандроўка павінна быць дакладна спланавана і падчас яе трэба строга прытрымлівацца правіл, інакш можна сутыкнуцца з небяспечнымі наступствамі. Але шмат каго прываблівае і непрадказальнасць у вандроўках, магчымасць час ад часу прымаць рашэнні, звязаныя з выбарам таго ці іншага варыянта маршруту.

Гэтаксама і з мовай. З аднаго боку, яна заснавана на дакладных правілах, якія трэба строга выконваць. А з другога – у адных і тых жа выпадках мова часам дазваляе зрабіць выбар у адпаведнасці з нашымі прыхільнасцямі, адчуваннем гармоніі маўлення.

Напрыклад, некаторыя назоўнікі ў тым ці іншым склоне і ліку могуць ужывацца не з адным, а з двума канчаткамі як варыянтнымі, якія дапускаюцца нормай літаратурнай мовы.

Адчуйце сябе падарожнікам па мове і знайдзіце такія словы ў прыведзенай табліцы. Запішыце дапушчальныя іх граматычныя формы для адпаведных склону і ліку. Насупраць астатніх слоў пастаўце прочыркі.

***Прыклад:***

| Склон і лік | Слова | Граматычныя формы |
|---|---|---|
| Творны, множны | *Вока* | *вачамі / вачыма* |
| Родны, множны | *Стол* | – |

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| **Склон і лік** | **Слова** | **Граматычныя формы** |
|---|---|---|
| Родны, множны | *апельсін* | |
| Месны, адзіночны | *брат* | |
| Творны, адзіночны | *кроў* | |
| Творны, множны | *грош* | |
| Месны, адзіночны | *каталог* | |
| Родны, множны | *карусель* | |
| Родны, множны | *кніга* | |

| | | |
|---|---|---|
| Родны, множны | *рог* | |
| Давальны, адзіночны | *збаўца* | |
| Давальны, адзіночны | *імя* | |
| Месны, адзіночны | *мост* | |
| Родны, множны | *форма* | |

**Заданне 4.** Кожнай часціне мовы ўласцівы свой набор граматычных і лексіка-граматычных катэгорый, прычым гэтым наборам ахопліваецца абсалютная большасць слоў пэўнай часціны мовы. Усё гэта значна ўскладняе засваенне любой мовы як замежнай.

***Цікава!*** *Склад часцін мовы ў розных мовах неаднолькавы. Адрозненні тычацца як аб'ёму асобных часцін мовы, так і ўсяго іх набору. Напрыклад, у сучаснай арабскай мове некаторыя мовазнаўцы вылучаюць усяго толькі тры часціны мовы (імя, дзеяслоў, часціцу).*

Дапамажыце Даніэлю зарыентавацца ў Граматыцы. Даніэль дапусціў некаторыя памылкі як у вызначэнні часцінамоўнай прыналежнасці вылучаных слоў, так і пры іх лексіка-граматычным і ўласна граматычным апісанні. Выпраўце, дзе гэта неабходна, памылкі і патлумачце, чаму меркаванне Даніэля было памылковым.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Гукі – гэта самыя першыя ўражанні, што глыбока западаюць у пачуцці ***немаўляці***[1]. Перш чым зразумець слова, дзіця авалодвае мовай гукаў.

Нашы маці ***цераз***[2] вопыт многіх пакаленняў добра ведалі, ***што***[3] першааснова душэўнага характва чалавека пачынаецца з калыскі, з ***той***[4] самай простай, геніяльнай у сваёй мудрасці і паэтычнасці песні, якая называецца – калыханка.

Як жа крыўдна, што сучасныя маці ***так***[5] рэдка спяваюць калыханкі сваім дзецям, што многія з іх самі не чулі калыханак, ***створаных***[6] і сагрэтых матчынымі сэрцамі (*В. Вітка*).

| Слова з тэксту | Лексіка-граматычная і граматычная характарыстыка | Выпраўленне памылкі (пры яе наяўнасці) | Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) |
|---|---|---|---|
| *немаўляці*[1] | Назоўнік: агульнага роду, рознаскланяльны | | |
| *цераз*[2] | Прыслоўе: акалічнаснае месца | | |
| *што*[3] | Злучнік: падпарадкавальны, тлумачальны | | |
| *той*[4] | Займеннік: указальны, мае нулявы канчатак | | |
| *так*[5] | Часціца: сэнсавая, узмацняльная | | |
| *створаных*[6] | Дзеепрыметнік: залежнага стану, утвораны ад дзеяслова стварацць пры дапамозе суфікса -*н*- | | |

**Заданне 5.** Падарожнічаць могуць не толькі людзі, але і словы! Многія словы вандруюць з мовы ў мову шмат стагоддзяў, па дарозе змяняючы сваё аблічча і прыходзячы ў новы дом-слоўнік амаль непазнавальнымі.

Прачытайце слоўнікавыя артыкулы з розных слоўнікаў, назавіце тып кожнага слоўніка. Уявіце сабе, што ўсе гэтыя артыкулы змешчаны ў адным слоўніку. Якую агульную лінгвістычную задачу магла б вырашаць такая лексікаграфічная крыніца?

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| **Слоўнікавы артыкул** | **З якога слоўніка ўзяты артыкул?** |
|---|---|
| БАРЭЛЬЕФ. Від скульптуры, у якой фігура выступае на плоскай паверхні менш чым на палавіну сваёй таўшчыні. | |
| БАРЭЛЬЕФ. Запаз. у XVIII ст. з франц. м. *bas-relief* (нізкая выпукласць). | |
| БАРЭЛЬЕФ. ад *-ба- і -рэльеф-*; *невытв.;* барэльефны, гарэльефны, рэльефны. | |
| БАРЭЛЬЕ́Ф *м. НВ* барэлье́ф, барэлье́фа, барэлье́фу, барэлье́фам, барэлье́фе; *мн. НВ* барэлье́фы, барэлье́фаў, барэлье́фам, барэлье́фамі, барэлье́фах. | |

Агульная задача:

______________________________________________________________

**Заданне 6.** Наступны прыпынак нашага падарожжа – Пунктуацыя. Уявіце, што існуе формула для вылічэння колькасці косак пры аднародных членах сказа:

$$x = n - 1,$$

дзе $x$ – колькасць косак, а $n$ – колькасць аднародных членаў.

Рашыце задачу:

Прапанаваны схемы сказаў з аднароднымі членамі без косак. Для якіх сказаў гэта формула правільная?

*Максімальная колькасць балаў – **7**.*

1. […○○○ і ○…].
2. […не толькі ○○○ але і ○…].
3. […○ і ○○ і ○…].
4. […і ○ і ○ і ○ і ○…].
5. […○ і ○ і ○ і ○…].
6. […і ○ і ○ і ○ або ○…].
7. […○○○ ці ○…].

Формула правільная для сказаў (*пазначце нумары*) ____________________

**Заданне 7.** Калі вы заўзяты турыст і прыхільнік здаровага ладу жыцця, вам будзе значна прасцей перакласці прапанаваны тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Горный туризм отличается от других видов не способом передвижения, а сложностью маршрута. В горный туризм входят элементы альпинизма и скалолазанья. Без специальной подготовки в горы ходить ни в коем случае нельзя: здесь на каждом шагу ты можешь

столкнуться с чем-то неожиданным. Не каждый легко переносит высоту. А ещё в горах опасно обжигающее солнце, угрожающие лавины, снежные карнизы. Не менее опасен и спелеотуризм, или пещерный туризм. Здесь требуются специальная одежда и снаряжение, знание особых приёмов спуска, подъёма, лазанья по узким проходам, особенностей пещер *(Энциклопедический словарь юного спортсмена)*.

**Заданне 8.** Працягваем наша падарожжа. Патлумачце Даніэлю некаторыя літаратуразнаўчыя паняцці і падбярыце да гэтых паняццяў прыклады з прапанаваных. У табліцу ўпішыце нумары ўсіх прыкладаў у патрэбныя ячэйкі. Памятайце, што адзін прыклад можа быць ілюстрацыяй да розных паняццяў.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

<table>
<tr><td>1.<br>Даруй мне, час, за слоў просталінейнасць, На ўяўнай злосці шал не наракай!<br>Не, выгінастай рыссю духу ленасць<br>Мяне не цікавала спадцішка!<br>Я ведаю: і рух жыцця, і тленнасць –<br>Усё ў тваіх упэўненых руках.<br>Ты нас вучыў не прыгінаць каленяў,<br>Калі прыйшлося ў поцемках блукаць.<br>Табе я з дзён маленства падначален,<br>І вось па бурным рэчышчы плыву<br>Да самага канечнага прычалу.<br>Але і там цябе я пазаву<br>Сказаць: хоць нас на вернасць не вянчалі,<br>Я сувязей з табой не разарву!<br>Алесь Звонак</td><td>2.<br>Чужой любві я не зайздрошчу,<br>Тут са сваёю нелады:<br>Я ў сэрцы ёй даю жылплошчу,<br>Ды ў ім утульна не заўжды.<br><br>Няўжо мой дар не пажаданы<br>І не прызнаны, сапраўды?<br>Тады бывай, бывай тады!<br>Любоў – не райскія сады,<br>Любоў – не дом падараваны,<br>Любоў – бяздомнік, прапісаны<br>У верным сэрцы назаўжды.<br>Аркадзь Куляшоў</td></tr>
<tr><td>3.<br>Лепей за ўсё мне на свеце мясціна<br>Тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос.<br>Бэз пад акном і на полі каліна…<br>Ціхае сонца, блакіты нябёс…<br>Кастусь Кірэенка</td><td>4.<br>Шчаслівай дарогі – да кахання.<br>Ад кахання і да кахання.<br>Бо дарога заўсёды, мусіць, пачынаецца ад кахання і вяртаецца зноў жа да кахання.<br>Янка Сіпакоў</td></tr>
<tr><td>5.<br>Гэта і ў сшытку неба<br>Занатавана зорамі, –<br>Каб чытаў я да скону ў сораме,<br>Што не ведаю нічога без мамы,<br>Што без мамы<br>Я – непісьменны самы!<br>Рыгор Барадулін</td><td>6.<br>Тут, дзе хапае да хлеба і солі<br>І на сталах не канчаецца мёд.<br>Тут, дзе не скончыцца песня ніколі<br>І не ўпадзе на калені народ!<br>Яўгенія Янішчыц</td></tr>
</table>

| **Тэрмін** | **Азначэнне тэрміна** | **Нумары прыкладаў** |
|---|---|---|
| Анафара | | |
| Дактыль | | |
| Санет | | |
| Эпіфара | | |

**Заданне 9.** Дапамажыце Даніэлю вызначыць праўдзівыя і няпраўдзівыя сцверджанні. Насупраць праўдзівых пастаўце знак “+”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Сцверджанне | Праўдзівае / няпраўдзівае |
|---|---|
| Францыск Скарына першы ў гісторыі ўсходнеславянскай культуры выдаў пераклад Бібліі | |
| У паэме “Кепска будзе!” Францішак Багушэвіч паказвае добрага чыноўніка, які дапамагае простым людзям змагацца з панам | |
| Усю прыгажосць спакойнага мора паказала Цётка ў аднайменным пейзажным вершы | |
| Сярод асноўных праблем п’есы “Раскіданае гняздо” Янкі Купалы – праблема зямлі і свабоды | |
| Прататыпам Андрэя Лабановіча з трылогіі “На ростанях” з’яўляецца Якуб Колас | |
| Максім Багдановіч у сваёй паэзіі пазбягаў тэмы горада, бо вельмі любіў вёску | |
| Алесь Гарун з’яўляецца аўтарам аднаго прыжыццёвага зборніка паэзіі | |
| Максім Гарэцкі ўвасобіў канцэпцыю беларускага нацыянальнага характару ў мастацкай літаратуры | |
| Змітрок Бядуля змагаўся супраць мадэрнізму ў літаратуры | |
| Ганна ў рамане “Людзі на балоце” Івана Мележа ўзяла шлюб з Яўхімам, бо больш не кахала Васіля, а пакахала Яўхіма | |
| Янка Брыль з’яўляецца адным з самых вядомых беларускіх аўтараў лірычнай прозы | |
| Васіль Быкаў у “Знаку бяды” апраўдвае дзеянні і ўчынкі Зміцера Гужа, бо яго бацьку раскулачылі | |

**Заданне 10.** Сёлета Даніэль збіраецца наведаць Беларусь, каб пабываць у яе культурнай сталіцы гэтага года – слаўным горадзе Слуцку. А яшчэ ён збіраецца наведаць мясціны, звязаныя з жыццём і/або творчасцю свайго любімага беларускага пісьменніка.

Гэта аўтар такіх апавяданняў, як “Літоўскі хутарок”, “Рускі” і інш., у якіх закладзена традыцыя філасофскай, інтэлектуальнай прозы. Ён вядомы як аўтар шэрагу слоўнікаў. Быў правадзейным сябрам Інбелкульта.

У лютым гэтага года адзначалася 130-годдзе з дня нараджэння любімага беларускага пісьменніка Даніэля.

**Назавіце гэтага пісьменніка.**

**Складзіце для Даніэля турыстычны маршрут, які павінен уключаць тры мясціны Беларусі, звязаныя з жыццём і/або творчасцю названага пісьменніка, а таксама ўкажыце, што там трэба абавязкова паглядзець.**

**Напішыце невялікі рэкламны тэкст экскурсіі, каб вашы аднагодкі захацелі таксама праехаць гэтым маршрутам. Звярніце ўвагу, што тэкст павінен быць адрасным.**

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Пісьменнік:* ____________________________________________

*Экскурсійны маршрут*

| Месца | Што абавязкова трэба паглядзець |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

*Рэклама* ________________________________________________________